# Прывітальнае слова

## акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, доктара гістарычных навук, прафесара Аляксандра Аляксандравіча Кавалені ўдзельнікам XI Міжнароднай маладзёжнай навукова-практычнай канферэнцыі «Вялікая Айчынная вайна 1941—1945 гадоў у гістарычнай памяці народа»

Шаноўныя ўдзельнікі канферэнцыі!

Ад імя вучоных Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі дазвольце выказаць словы ўдзячнасці арганізатарам XI Міжнароднай маладзёжнай навукова-практычнай канферэнцыі «Вялікая Айчынная вайна 1941—1945 гадоў у гістарычнай памяці народа».

Не будзе перабольшаннем сказаць, што ў нашай краіне шмат робіцца дзеля захавання памяці аб усіх тых, хто ў той час змагаўся на фронце, не даваў спакою агрэсарам на акупіраванай тэрыторыі. За пасляваенны час айчынныя даследчыкі і публіцысты выдалі каля 12 тысяч прац.

Важнасць нашага навуковага форуму не толькі ў тым, каб яшчэ раз звярнуць увагу грамадства на трагедыю вайны, але і ў тым, каб перасцерагчы грамадскую думку ад мэтанакіраванай фальсіфікацыі падзей Вялікай Айчыннай вайны. Сёння назіраецца небывалы перагляд не толькі геапалітычнага значэння вайны, але і маральна-этычных вынікаў Вялікай Перамогі над нацызмам. На нашых вачах адбываецца не проста рэвізія Другой сусветнай вайны, але і рэабілітацыя злачынных ідэалогій, іх інстытуцыянальнае адраджэнне і легалізацыя.

Былыя калабарацыяністы, якія сёння называюць сябе «младаеўрапейцамі», імкнуцца апраўдаць сваё супрацоўніцтва з нацыстамі, усё больш настойліва выкарыстоўваюць аргумент пра «два таталітарныя рэжымы». Менавіта па іх ініцыятыве на еўрапейскім узроўні адбылася фармалізацыя гэтай «канцэпцыі», а 2 красавіка 2009 г. Еўрапарламент зацвердзіў Еўрапейскі дзень памяці ахвяр сталінізму і нацызму. Звярніце ўвагу: гэты дакумент ускладае віну і адказнасць за развязванне Другой сусветнай вайны на СССР, на нашых дзядоў і прадзедаў.

Фальсіфікатарам гісторыі варта напомніць вынікі Нюрнбергскага трыбунала, у прысудзе якога ад 1 кастрычніка 1946 г., у прыватнасці, гаварылася: «22 чэрвеня 1941 года без аб'яўлення вайны Германія ўварвалася на савецкую тэрыторыю ў адпаведнасці з загадзя падрыхтаванымі планамі. Доказы, прадстаўленыя Трыбуналу, пацвярджаюць, што Германія мела старанна распрацаваныя планы знішчыць СССР як палітычную і ваенную сілу, каб расчысціць шлях для экспансіі Германіі на Усход у адпаведнасці з яе імкненнямі».

На жаль, і ў нашай краіне, якая страціла кожнага трэцяга жыхара, знаходзяцца псеўдапатрыёты, што імкнуцца рэабілітаваць тых, хто ў гады ваеннай навалы актыўна супрацоўнічаў з германскімі варварамі, падзяляючы нянавісць да беларусаў. Званы Хатыні зноў і зноў нагадваюць нам пра велізарную, небывалую ў гісторыі трагедыю і засцерагаюць нас ад бяспамяцтва, каб не знішчыць памяць аб тых, хто ахвяраваў сваё жыццё дзеля Вялікай Перамогі.

Хачу звярнуць увагу маладога пакалення даследчыкаў на той факт, што фальсіфікацыя гісторыі Вялікай Айчыннай вайны сёння — кагнітыўная зброя. Гэта імкненне ўкараніць у інтэлектуальнае асяроддзе, асабліва падрастаючага пакалення, ілжывыя парадыгмы, канцэпцыі, стратэгіі і «навуковыя тэорыі», якія потым будуць успрыняты не толькі шырокім колам грамадства, але і палітычнай элітай краіны. А гэта значыць, робіцца мэтанакіраваная праца, каб запраграмаваць нацыянальную эліту і нацыю ў цэлым на прыняцце лжывых рашэнняў развіцця сваёй краіны. Дзякуй Богу, сёння Прэзідэнт нашай краіны А. Р. Лукашэнка цвёрда, паслядоўна і непахісна адстойвае праўду вайны і Вялікую Перамогу. Нядаўна на сустрэчы з таленавітай моладдзю Аляксандр Рыгоравіч яшчэ раз

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

падкрэсліў неабходнасць захоўваць памяць аб ваенным пакаленні.

Адзначу, што вучоныя Нацыянальнай акадэміі навук шмат робяць дзеля навуковага асвятлення гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Праведзены дзясяткі навуковых канферэнцый, выдадзены сотні грунтоўных даследаванняў, у якіх аб'ектыўна раскрываюцца гераічная, самаахвярная барацьба ваеннага пакалення і трагедыя беларускага народа. Як ні ў адной іншай краіне былога СССР, у Беларусі падрыхтавана 146-томная серыя кніг «Памяць», у якіх раскрываецца гераічная барацьба, паказваецца трагедыя беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Зусім нядаўна мы разам з вучонымі Расіі закончылі выкананне ўнікальнага праекта «Страна в огне». Толькі ўчора я атрымаў дзве кнігі апошняга трэцяга тома. Гэта выданне ў Расійскай Федэрацыі стала лаўрэатам нацыянальнай прэміі «Лепшыя кнігі і выдавецтвы года» ў намінацыі «Гісторыя».

Маладому пакаленню неабходна пастаянна напамінаць, што жорсткасць і насілле германскіх варвараў былі невыпадковай з'явай. Гэта быў загадзя распрацаваны, абдуманы і мэтанакіраваны план генацыду, рабавання нацыянальнага багацця краіны, ліквідацыі дзяржаўнага ладу. Такіх злачынстваў, якія чынілі акупанты па сваёй жорсткасці, бесчалавечнасці і масавасці не ведала гісторыя. Звернем увагу на выдадзеную для асабовага складу вермахта «Памятку нямецкага салдата», у якой гаварылася: «У цябе няма сэрца, нерваў, на вайне яны не патрэбны. Знішчы ў сабе жаль і спачуванне — забівай усякага рускага, савецкага, не спыняйся, калі перад табой стары або жанчына, дзяўчынка альбо хлопчык, — забівай, гэтым ты выратуеш сябе ад гібелі, забяспечыш будучыню сваёй сям'і і праславішся навекі...».

Так і дзейнічалі нацысцкія варвары. Ужо ў ліпені 1941 г. паліцэйскі полк «Цэнтр» арганізаваў карную акцыю ў Белавежскай пушчы і прылеглых да яе раёнах, у ходзе якой былі спалены 34 населеныя пункты. У ліпені—жніўні 1941 г. праводзілася карная аперацыя «Прыпяцкія балоты», у ходзе якой 13 жніўня 1941 г. знішчана 13 788 чалавек. У верасні—кастрычніку 1941 г. на тэрыторыі Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай і Брэсцкай абласцей праведзена 10 аперацый, у выніку якіх, як сведчаць справаздачныя дакументы карнікаў, знішчана 7162 чалавекі.

Жорсткасць не зламіла волю беларускага народа да барацьбы. З кожным днём пашыралася супраціўленне агрэсарам. На акупіраванай тэрыторыі ўпартую барацьбу супраць захопнікаў дзень і ноч вялі 374 тыс. партызан, 70 тыс. падпольшчыкаў, звыш 400 тыс. жыхароў Беларусі з'яўляліся рэзервам партызан. Больш за 1,3 млн нашых суайчыннікаў змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Вядома, што ў кожнага былі родзічы, якія падтрымлівалі і аказвалі магчымую дапамогу патрыётам, таму гэтую лічбу неабходна павялічыць як мінімум у тры разы. Такога масавага патрыятычнага ўздыму не ведае гісторыя. Ні ў адной еўрапейскай краіне не было такога масавага супраціўлення. Таму без перабольшання мы гаворым, што беларусы вялі ўсенародную барацьбу супраць германскіх агрэсараў. Тым больш што ёсць тысячы і тысячы прыкладаў самаахвярнай барацьбы.

Яшчэ ў часы СССР была выдадзена кніга «Говорят погибшие герои. Предсмертные письма борцов с фашизмом», якая вытрымала дзевяць выданняў. Гэта кніга — яскравае сведчанне моцы духу маладога пакалення. Старонка за старонкай асвятляе бязмежны гераізм, самаахвярнасць, бязмерную любоў да жыцця тысяч маладых патрыётаў: «Не надо слёз, — піша ў сваім лісце незадоўга да пакарання актыўны ўдзельнік мінскага падполля Іван Казлоў. — Не надо отчаяния. Наша кровь не прольётся даром. Крепитесь, крепитесь, не бойтесь и не отчаивайтесь. Эх! Жить чертовски хочется! Мстить этим варварам — вот что нужно делать».

Шаноўныя ўдзельнікі навуковай канферэнцыі, паважаныя настаўнікі!

Званы Хатыні і вечна жывыя галасы загінуўшых патрыётаў, мільёны імёнаў тых, хто наперакор насаджэнню гвалту і жаху на нашай шматпакутнай зямлі самаахвярна змагаўся з германскімі агрэсарамі і перамог, адстаяў незалежнасць і свабоду беларускага народа, заклікаюць нас самаададана, як гэта зрабілі яны ў час суровых выпрабаванняў, непахісна адстойваць праўду падзей Вялікай Айчыннай вайны.

Яшчэ раз віншую са святам ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ!

Дзякуй за ўвагу!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ